*А ты – святая, як сама любоў –*
*Раджала фараонаў і рабоў,*
*Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.*
*Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра,*
*Твая заўсёды гожая пара.*
*Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца* [1, с. 205].

Адметна, што цыкл санетаў напоўнены нязвыклай для паэзіі свайго часу пачуццёвасцю. Улічваючы той факт, што "інтымны свет беларусаў увогуле вылучаецца большай стрыманасцю і цнатлівасцю ў параўнанні нават з блізкімі суседзямі, а нацыянальны эрас мае шляхетны і далікатны характар" [5, с. 59], як адзначае Ю. Пацюпа, выглядае заканамернай несфарміраванасць устойлівай традыцыі ва ўвасабленні эратычных матываў у айчыннай паэзіі XX стагоддзя. Нягледзячы на тое, што некаторыя сучаснікі М. Багдановіча, да прыкладу, У. Жылка ці З. Бядуля, падхапілі пачынанне паэта, у савецкі перыяд такія вершы былі хутчэй факультатыўнымі, адзінкавымі з'явамі. Вянок санетаў "Жанчына" Я. Сіпакова якраз і з'яўляецца выключэннем з агульнага правіла. Каханне ў цыкле паказана вельмі натуральна: "*Я да цябе, сасмяглы ўвесь, прынік, / Ты да мяне, шчаслівая, прынікла, / І радасная тоеснасць, бы крык, / На ўсе вякі адна – адна! – узнікла*" [1, с. 201]. Вобраз жанчыны ва ўспрыманні лірычнага героя не губляе, аднак, сваёй чысціні і цноты ў вершах падобнага гучання. Мужчына змагаецца са сваёй спакусай і ўсведамляе мяккую ўладу жанчыны.

Такім чынам, у інтымнай лірыцы Янка Сіпакоў з аднолькавым поспехам карыстаецца рознымі класічнымі жанрамі: баладай, элегіяй, одай, філасафемай інш. Паэт паслядоўна звяртаецца і да больш складанай цвёрдай формы верша – санета. Вянок санетаў "Жанчына" Я. Сіпакова – адзін з лепшых цыклаў у яго паэтычнай спадчыне – уяўляе сабой гімн жанчыне, раскрывае яе сутнасць і прызначэнне, місію на Зямлі. Паэт па-філасофску атаясамлівае паняцці кахання і жыцця, бо менавіта любая жанчына надае яму сэнс і кірунак. Разам з тым вобраз лірычнай гераіні ў Я. Сіпакова надзелены нязвыклай для тагачаснай літаратуры пачуццёвасцю, у яе апісанні прысутнічаюць відавочныя прыкметы эратызму.

**Літаратура**

1 Сіпакоў, Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1. – Паэзія. – 431 с.

2 Лысенка, А. Ф. Лінія гарызонта. Нарыс творчасці Янкі Сіпакова / А. Ф. Лысенка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 119 с.

3 Анцімонік, А. В. Экзістэнцыйныя праблемы ў лірыцы Я. Сіпакова / А. В. Анцімонік // Роднае слова. – № 1. – С. 20–21.

4 Фрейд, З. Влечения и их судьба / З. Фрейд ; пер. М. В. Вульф, Р. Ф. Додельцев. – Москва : ЗАО Изд-во «ЭКСМО–Пресс», 1999. – 432 с.

5 Пацюпа, Ю. Зайгранне, або Ярныя (эратычныя) матывы ў ранняй творчасці Янкі Купалы і Максіма Багдановіча / Ю. Пацюпа // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Гродна, 4–6 кастрычніка 1995 г. / Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; рэдкал. : І. Жук [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 1996. – С. 52–60.

**УДК 821.161.3**

***В. Ю. Плешавеня***

## ЛЮДМІЛА РУБЛЕЎСКАЯ: АД ПАЭЗІІ ДА ПРОЗЫ

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню спецыфікі мастацкай манеры сучаснай беларускай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай. Разгледжаны творчы шлях аўтаркі ад паэ-*

*тычных да празаічных твораў, характаралагічныя рысы паэтычнай творчасці і жанравая разнастайнасць празаічных твораў Л. Рублеўскай у зборніках “Крокі па старых лесвіцах” (1990), “Адукацыя” (1990), “З’яўленне інфанты” (2015), цыкла апавяданняў “Старасвецкія міфы горада Б.” (2002), рамане “Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега” (2012).*

Людміла Рублеўская – адна з самых вядомых пісьменніц сучаснай беларускай літаратуры. Свой творчы шлях пачынала яна з паэзіі, а зараз працуе ў жанры гістарычнага дэтэктыва. Аўтарка больш за трыццаці кніг розных жанраў – паэзіі, прозы, драматургіі, эсэістыкі, крытыкі. Л. Рублеўская – уладальніца шматлікіх узнагарод і літаратурных прэмій.

Людміла Рублеўская – пісьменніца, у творчым активе якой на сённяшні дзень значнае месца займаюць менавіта празаічныя творы (толькі ў чэрвені 2023 года прайшла прэзентацыя новага рамана “Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка Менскага”), аднак яна дэбютавала як паэтка.

1990 год стаў знакавым для Л. Рублеўскай, таму што чытач змог пазнаёміцца з дзвюма яе кнігамі лірыкі – “Крокі па старых лесвіцах” і “Адукацыя”. “Крокі па старых лесвіцах” – першы паэтычны зборнік Людмілы Рублеўскай, у які ўвайшлі вершы і паэмы, песні і балады, прысвечаныя гісторыі і культуры Беларусі.

На своеасаблівым падмурку беларускіх народных святаў, міфалогіі, нацыянальнай літаратуры, гісторыі паэтка дае магчымасць кожнаму чытачу задумацца аб мінулым і будучым беларусаў. У творах Л. Рублеўскай няма самалюбавання, патэтыкі, толькі страшэнны боль, хваляванне за стан роднай культуры, спробы пошуку выйсця і захавання памяці пра мінуўшчыну. Заключным для зборніка становіцца верш «Выбар», у якім Л. Рублеўская пакідае кожнаму права выбару: “*Падвойнае неба сузор’і двоіць. // І справа, і злева – званіцы. // А слова патрэбна, якое баліць, // І мова, якою маліцца*” [1, с. 42]. Зборнік “Адукацыя” – пасланне для ўсіх тых, хто згубіўся, хто адчувае адзіноту, хто шукае ў сабе сапраўднага беларуса. Менавіта таму пачынаюць і завяршаюць зборнік вершы, якія адначасова прасякнутыя болем за лёс беларусаў і рашучасцю вярнуцца да сваіх каранёў: “*І на Купалле не лунаюць // Дзяўчыны ў лозах ля ракі // Прабабкі іх даўно аддалі // Чужынцам белыя вянкі...*” [2, с. 4], “*Толькі Бог цераз нас не дазволіць ніколі // Свой закон запісаць на чужыя скрыжалі*” [2, с. 25]. На першы погляд, творы зборніка здаюцца зусім рознымі, але ўсе яны прасякнуты дабрынёю, любоўю да сваёй Радзімы і адданасцю ёй. Трэба адзначыць, што амаль усе вершы абодвух зборнікаў з’яўляюцца актуальнымі і ў наш час.

На гэтым паэтычныя поспехі аўтаркі не скончыліся, і свет убачылі зборнікі “Замак месячнага сяйва” (1992), “Застаюся” (1996), “Балаган” (2000), “Рыцарскія хронікі” (2001), “Над замкавай вежай” (2003), зборнік верашаў і эсэ “Шыпшына для пані” (2007), які аб’яднаў лепшыя паэтычныя набыткі Л. Рублеўскай у адно канцэптуальнае цэлае, схаванае за аўтарскім вобразам “сад” [3].

Асобна вылучаецца зборнік гістарычных вершаў-міфаў пра Беларусь ад рыцарскіх часоў да падзей сучаснасці “З’яўленне інфанты” (2015). Гэта ўнікальны збор твораў, чытаючы які не толькі адчуваеш бег часу, але і неверагодную хуткасць змены эмоцый. У паэтычным зборніку вылучаны тры асноўныя раздзелы: “Міты”, “Дакументы” і “Рэаліі”. Дадатковы раздзел носіць незвычайную назву – “З.Ы. Мемуары”, які пісьменніца пазначыла як “Бестыярый майго савецкага дзяцінства”. Цэнтральнымі аб’ектамі твораў становяцца рыцары, міфалагічныя істоты, постаці мінуўшчыны, лёсавызначальныя падзеі, артэфакты культуры. Асаблівая ўвага ў зборніку надаецца постаці і мастацкавобразнаму свету Я. Купалы. У гэтым зборніку змешчаны філасофскія, інтэлектуальныя вершы, з горкай усмешкай і незнішчальным нацыянальным рамантызмам. Грандыёзным фіналам зборніка стануць абсурдныя і вясёлыя вершы, дзе сустрэнуцца героі дзіцячай літаратуры, а таксама цікавы персанаж “Ікуку”.

У сваіх лірычных творах пісьменніца стварыла высакародную мастацкую рэканструкцыю далёкіх падзей, непаўторныя і выразныя паэтычныя партрэты асветнікаў.

Мастацка-гістарычны свет Л. Рублеўскай грунтуецца на некалькіх тэмах-дамінантах: знакамітыя людзі, асобы мінулага, лёсавызначальныя падзеі, культурныя артэфакты, вобразы сармацкіх рыцараў. Паэтка стварае цэлую галерэю вобразаў славутых постацей Беларусі і імкнецца раскрыць перад чытачом іх духоўны вопыт, знайсці крыніцы, якія давалі падзвіжнікам чысціню, святло і сілу. Іх жыццё і дзейнасць Л. Рублеўская лічыць прыкладам маральнай дасканаласці і грамадзянскай самаадданасці. У лірыцы Л. Рублеўскай выяўляецца не толькі трывога за будучы лёс Беларусі, але і ўпэўненасць у моцы нацыянальнай культуры.

Творчая манера пісьменніцы вызначаецца актыўным літаратурным пошукам, пастаянным зваротам да эксперыментаў у галіне жанру і зместу. Апавяданні, аповесці, раманы, нават дзіцячыя казкі Л. Рублеўскай карыстаюцца поспехам у чытачоў самага рознага ўзросту – ад самых маленькіх да дарослых. Л. Рублеўская стала прадаўжальніцай лепшых традыцый У. Караткевіча. Грунтуючыся на гістарычным матэрыяле, выкарыстоўваючы арсенал гістарычнай прозы побач з арсеналам прыгодніцкага жанру, аўтарка імкнецца данесці чытачу прыгажосць і веліч дзеяў нашых продкаў, веліч нацыянальнай культуры, выскокую годнасць беларусаў. Таксама творы пісьменніцы прыцягваюць увагу чытача зваротам да так званых вечных тэм – кахання, пошуку сэнсу жыцця.

Значнае месца ў творчасці Л. Рублеўскай займае гепталогія пра Панціша Вырвіча. Гісторыя “*учарашняга навучэнца Менскага езуіцкага калегіюма, а сёння – прайдзісвета, галадранца, валацугі*” Пранцыся і доктара Баўтрамея Лёдніка пачалася ў 2012 годзе, калі была выдадзена першая кніга цыкла – “Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега” [4, с. 11]. Л. Рублеўская вызначае яго як прыгодніцкі і фантасмагарычны раман, але даследчыца Н. Б. Лысова справядліва звяртае ўвагу, што “нягледзячы на аўтарскае (ці рэдактарскае) вызначэнне «фантасмагарычны», можна таксама аднесці да класічнага рамантычнага гістарычнага рамана” [5, с. 13]. Як слушна адзначае Дз. Я. Бугаёў, “тэорыя літаратуры пакуль што не зафіксавала такой мастацкай формы, як паралельны раман, аднак гэта форма ў аўтаркі атрымалася” [6, с. 208].

Героямі твора выступаюць як выдуманыя персанажы, так і рэальныя гістарычныя асобы. Сюжэт гэтай кнігі літаральна насычаны разнастайнымі падзеямі. Знайшлося тут месца і для бітваў, уцёкаў з вязніцы, і разгадвання таямніц старажытнага лабірынта. Л. Рублеўская выкарыстоўвае гістарычныя факты, звяртаецца да рэальных гістарычных персанажаў, каб падкрэсліць важнасць пачуцця нацыянальнай свядомасці, адданасці радзіме. На фоне супрацьстаяння магнацкіх родаў і розных груповак прыкметна вылучаюцца некалькі асоб, знаёмства з якімі істотна ўплывае на светапогляд Пранціша Вырвіча і выступае свайго роду выпрабаваннем для Бутрыма Лёдніка.

У кнізе хапае і разнастайных апісанняў гістарычных рэалій. Чытач даведаецца, як звычайны чалавек мог ператварыцца з раба ў шляхціца, якая была ўнутрыпалітычная расстаноўка сіл у Рэчы Паспалітай, якія лекавыя сродкі выкарыстоўвалі ў тыя часы. Нельга не пагадзіцца, што ідэя рамана – гэта адказнасць нашчадкаў за справы продкаў, пераемнасць мінулага, сучаснага і будучага. У творы асэнсоўваюцца гістарычныя карані беларусаў.

Як у сваіх лірычных творах, так і ў празаічных Л. Рублеўская выкарыстоўвае міфалагічную аснову. Прыкладам служыць цыкл апавяданняў “Старасвецкія міфы горада Б.” (2002). Гэта своеасаблівая пераапрацоўка 12 старажытнагрэчаскіх міфаў, дзе месцы галоўных герояў – антычных багоў – займаюць простыя тубыльцы. З героямі апавяданняў здараюцца разнастайныя неверагодныя падзеі, якія не проста здзіўляюць, а палохаюць усіх навакольных і саміх герояў, але гэта доўжыцца не доўга і ўсе здарэнні тлумачацца досыць будзённа.

Л. Рублеўская паспяхова выкарыстоўваюе і традыцыі класічнага англійскага гатычнага рамана. У апавяданнях “Дыярыуш пані”, “Жаніх пані Данусі”, рамане “Скокі смерці” пісьменніца актыўна выкарыстоўвае элементы гатычнай паэтыкі: дзеянне

адбываецца ў змрочных замках, сядзібах, касцёлах, на могілках, пераважна ноччу, у неспрыяльнае надвор'е, прысутнічаюць інфернальныя істоты, чытач запалоханы прадчуваннем блізкай трагедыі.

У гатычных творах пісьменніцы падаюцца і звязваюцца ў адно некалькі пластоў часу, а гісторыя краіны асэнсоўваецца праз асобу і сям'ю. У цэнтры апавядання, як правіла, знаходзіцца кананічны гатычны матыў сямейнага праклёну, які можа быць звязаны з рэальным грахом або злачынствам, што перадаецца з пакалення ў пакаленне шляхам выпадковага і часта наўмыснага знішчэння чалавека, памяці пра ўласнае мінулае, што непазбежна вядзе да асабістага крызісу. Л. Рублеўская выразна паказвае, што неабходна абапірацца на мінулае, каб будаваць сучаснасць.

Такім чынам, Л. Рублеўская – прыклад унікальнай пісьменніцы, якая па-майстэрску апрацоўвае культуру і гісторыю беларускага народа як у паэтычных творах, так і ў празаічных. Аўтарка яскрава паказвае, як важна захоўваць нацыянальную самасвядомасць, працягваць традыцыі продкаў, не губляць сябе ў сучасным свеце. У зборніку "Адукацыя" была размешчана рэклама самога зборніка ад чытача пад псеўданімам "Алесь з-пад Крупак", які пісаў: "Чытаць, усім чытаць!". Гэты слоган можна аднесці да кожнай кнігі Людмілы Рублеўскай. Чытаць, усім чытаць!

## Літаратура

1 Рублеўская, Л. Крокі па старых лесвіцах / Л. Рублеўская. – Мінск : ЦК КП Беларусі, 1990. – 45 с.

2 Рублеўская, Л. Адукацыя / Л. Рублеўская. – Мінск : ЦК КП Беларусі, 1990. – 26 с.

3 Хоміч, Т. П. Асаблівасці творчага самавыяўлення ў паэзіі Людмілы Рублеўскай [Электронны рэсурс] / Т. П. Хоміч. – Рэжым доступу: http://lir-book.by/ – Дата доступу: 19.04.2024.

4 Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега / Л. Рублеўская. – Мінск : Звязда, 2017. – 368 с.

5 Лысова, Н. Б. Гістарычная проза Людмілы Рублеўскай: да характарыстыкі жанру / Н. Б. Лысова // Весн. Полацк. дзярж. ун-та. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2013. – № 10. – С. 12–17.

6 Бугаёў, Дз. Беларускі дэтэктыў Людмілы Рублеўскай / Дз. Бугаёў // Полымя. – 2006. – № 7. – С. 207–212.

**УДК 811.161.1'42'371'373.614'367.622**

***Я. И. Прокопчик***

# О ВНУТРЕННЕЙ ФОРМЕ НАИМЕНОВАНИЙ ОТРИЦАТЕЛЬНЫХ ЭМОЦИЙ С ИСХОДНЫМ ЗНАЧЕНИЕМ НАНЕСЕНИЯ ФИЗИЧЕСКОГО УЩЕРБА

*Статья посвящена анализу имен существительных-наименований отрицательных эмоций, которые выражают семантику отрицательных эмоционально-психических состояний, являются преимущественно непроизводными и имеют затемненную внутреннюю форму в современном русском языке. Определены исходные значения, связанные с отражением представлений о нанесении физического ущерба. Выявлены метафорические модели, лежащие в основе формирования семантики рассматриваемых слов.*

Слово включает в себя, кроме звуков и значения, ещё и представление, лежащее в основе наименования – внутреннюю форму. Внутренняя форма слова в наиболее общем виде